Ганчарова-Цынкевіч Т.У., Курыленка Г.М.

# “Ля гэтых сосен нельга не спяваць…”: да праблемы “чалавек і прырода” ў паэзіі Максіма Танка

Паэзія Максіма Танка – непаўторная з’ява ў сучаснай беларускай літаратуры, якая ўвабрала ў сябе шмат перажытага і перадуманага, асабіста асэнсаванага мастаком, усё каштоўнае, што выпрацавала чалавечая думка. Сам пісьменнік гаварыў: “Я ўсё больш пачынаю думаць, што сапраўдная паэзія пачынаецца не ад слоўнай і рытмічнай эквілібрыстыкі, але – ад думкі” [3, с. 209].

У аснове творчасці М.Танка ляжыць пэўная падзея, канкрэтная думка. Яго верш – гэта адбітак душы паэта, яго маральнае адчуванне, успаміны, перажыванні.

Пасля бясконцых пошукаў,
Хоць са спазненнем, зразумеў:
Паэзія – гэта тое,
Міма чаго
Мы праходзім штодзень… [2, с. 579].

Мастак ведае, што на бацькоўскай зямлі няма нічога выпадковага. Ён перакананы, што існуе раўнавага ў прыродзе і духоўным жыцці чалавека.

Геацэнтрызм – адна з важнейшых рысаў усёй творчасці М.Танка, які характарызуецца моцным праяўленнем прывязанасці паэта да роднай зямлі, да нарачанскага возера, да нарачанскіх берагоў, да нарачанскіх сосен. Усё гэта ва ўяўленні творцы неаддзельна звязана з паняццем Радзімы, Бацькаўшчыны, роднага краю.

Паэтычным мысленнем М.Танк быў звязаны з мастацкай свядомасцю народа і эстэтычным вопытам ХХ стагоддзя. Паэт нястомна шукаў такую форму верша, якая б найбольш пэўна адпавядала сутнасці з’яў, спалучала зрокавы вобраз з шырынёй эстэтычных уяўленняў, падпарадкоўваючы законы паэтыкі законам прыроды. Таму верлібр ён асвоіў яшчэ ў маладыя гады ва ўмовах заходнебеларускай рэчаіснасці 30-х гадоў як новую канцэпцыю існавання.

Ад твора да твора паэт удасканальваецца, верш становіцца больш інтэлектуальным, філасафічным, тым мацней яго цягне да багацця штодзённага жыцця, якое бачыцца ў грамадзянскай адказнасці, сялянскіх клопатах, ударах навальніцы, шуму сосен, сузор’ях траў, хвалях Нарачы і ззянні зор над Свіцяззю.

Трэба, ведама, нашча ўставаць,
Без ніякіх там камандзіровак.
Вось азёрныя хвалі шумяць
І гудзе галасамі дуброва,
Вось аблокі плывуць над зямлёй.
І ўсё гэта зусім непаўторна
Ў спалучэнні з гуллівай вясной,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У сугуччы блакітнага з чорным [2, с. 226].

Славуты нарачанскі край… Усё тут тыповае для Беларусі: клімат, прырода, ландшафт. Але ёсць тут нешта большае, напоўненае вабным зместам аблічча, якое зачароўвае сваёй пяшчотай, уражвае глыбокай філасофіяй існавання:

Нарач, як мора шуміць
і на бераг круты наступае,
Дыміць над вягарамі і над палямі туман.
З ветрам узняўшыся, кружыцца вывадак чаек,
Спуджаных скрыпам абозаў і звонам кайдан [2, с. 35].

Звычайная зямля… Але тут жыве працавіты народ, які адчувае сваю высакароднасць і значнасць у гістарычным працэсе. Зразумела, што ў такіх прыгожых мясцінах Беларусі не мог не нарадзіцца такі дасканалы мастак слова. Менавіта таму ў цэнтры творчасці М.Танка заўсёды знаходзіцца народны характар з уласцівымі яму маральнасцю і дабрынёй, з пачуццём міласэрнасці і замілавання да ўсяго існага.

Нельга не звярнуць увагу на такія маляўнічыя вершы, як “Зіма”, “Ёлка”, “Вырай”, “Вясной”, “Вясна-красна на ўвесь свет”, “Восень” і інш. Так, у вершы “Зіма” сапраўднае мастацкае слова спалучаецца з шырокім абагульненнем рэчаіснасці. Паэт малюе вобраз снежаньскай зімы:

Зіма… Ад інею вішняк
Перахіліўся за парканы,
І не мінеш яго ніяк,
Кранеш – цветам серабраным
Асыпле з галавы да ног.
На дзённікі лятуць вароны
З глухіх прасёлачных дарог… [2, с. 223].

Зіма ахапіла ўсё наваколле: “стагі лугоў”, балоты, лясы, пагнала “плыты ільдзін па Нёману”. Сосны залатыя нагадваюць “полымя сівое”. Прырода ахоплена фантастычна-казачным настроем. Аўтар жывапісуе словам. Паэзія твора ў экспрэсіўнасці мовы, вобразнасці і пластычнасці думкі.

Вельмі цікавы ў гэтым плане верш “Восень”, які нагадвае легенду. У творы надзвычай ярка відаць высокае майстэрства паэта, якое выражана ў выяўленчай вобразнасці мовы. М.Танк знаходзіць такія словы, якія вельмі дакладна перадаюць разнастайнасць восеньскіх фарбаў роднай зямлі, сапраўдную маляўнічую карціну беларускай прыроды:

Восень вецце сухое зграбла і на ўзлессі
Падпаліла пагрэцца начлежны касцёр.
Падпаліла касцёр, прылягла ў тумане,
Ды кароткі быў гэты пад зорамі сон:
Крык трывожны птушыны збудзіў яе рана,
Па зямлі ад кастра разліваўся агонь [2, с. 238 – 239].

Узбуйняючы вобраз, аўтар канкрэтызуе паэтычную асацыятыўнасць думкі і перажывання. Густым мазком фарбы, інтанацыйнай экспрэсіяй і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рухомасцю радка ён стварае дэталёвае апісанне восеньскага краявіду беларускай прыроды.

Вобразнасць паэзіі М.Танка заўсёды спалучаецца з багаццем колераў і гукаў зямлі, фарбамі і пахамі прастораў. У сувязі з гэтым трэба згадаць вершы “Колер Дуная”, “Колер зямлі”, “Колер снегу”.

Кажуць: Дунай блакітны.
Кажуць: Дунай залацісты.
А ён такі колер мае,
З якімі вачамі глядзіш ты
На хвалі яго крутыя… [2, с. 461].

Пісьменнік шчыра дзеліцца з людзьмі асабістым рамантычным падыходам да кожнай жыццёвай з’явы, якая звяртае на сябе яго ўвагу.

М.Танк не адухаўляе прыроду, а малюе яе як жывую істоту, размаўляючы з ёй:

Можа мала цябе, зямля,
Каласамі я абнаўляў,
Прыбіраў вянкамі садоў
І сузор’ямі гарадоў,
З году ў год потым шчыра мыў
Плечы зраненых тваіх ніў?..
А ты прыпамінаеш, зямля,
Колер шэры майго шынеля [2, с. 519].

Зямля – вызначальная прыродная і духоўная канстанта быцця чалавека. У мастацкай свядомасці паэта зямля – значная тэма творчасці, дзе спалучаецца багацце вобразаў, матываў, значэнняў. Пачыналася яднанне паэта з бацькоўскай зямлёй ад пачутых у сваім сэрцы яе колераў, пахаў, гукаў.

Верш-споведзь “Колер зямлі” – сапраўдны летапіс жыцця, вынік напружанай думкі аўтара. Лірычны зварот паэта да зямлі адразу палоніць шчырым пачуццём сыноўняй любові, адданасці роднаму краю. Прыгожы эпітат “сузор’ямі гарадоў” абуджае ўяўленне пра шматлікія людскія пасяленні на ўсёй зямлі. Радкі “з году ў год потым шчыра мыў плечы зраненых тваіх ніў” кранаюць пачуццём замілавання да зямлі, якая адроджана самаадданай працай людзей. У творы вобраз зямлі – гэта сімвал высокай красы і духоўнай каштоўнасці народа. Эстэтыка зямлі ўзвышае лірычнага героя, дае надзею на адраджэнне духоўнага і фізічнага пачаткаў.

У вершы “Колер снегу” М.Танк прызнаецца, што нічога больш рознакалёрнага, як снег, не ведае:

Нічога больш рознакалёрнага,
Як узмяцелены снег,
Я не знаю.

Які ён быў сіні,
Калі замярзаў я…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Які быў ружовы,
Калі я страсануў яго з плеч…

Які ён быў чорны,
Калі замятаў
След растання з радзімай!

Які быў чырвоны
На брустверах нашых акопаў!..

Які быў іскрысты і светлы,
Калі яго дзеці
Прыносілі мне ў падарунак [2, с. 539].

Кожны колер снегу набывае ў вершы пэўнае сэнсавае значэнне. За кожным лірычным роздумам гучыць закончаная аўтарская думка, якая канкрэтызуе ідэю твора: моцная паэтычная экспрэсія краявідаў роднай зямлі ў зрэзе пэўнага часу чалавечага быцця.

Творчая канцэпцыя паэзіі М.Танка – багацце колераў і гукаў беларускай прыроды. Гэта адзін са скразных прынцыпаў яго лірыкі. Нельга не здзіўляцца невычэрпнасці мастацкай вобразнасці паэта. Цяжка ў яго знайсці творы, дзе б паўтараліся палітра фарбаў, зрокавы малюнак, пульс думкі, рытміка верша.

Лірычны герой М.Танка – глыбокі патрыёт сваёй зямлі. Яго біяграфія раскрываецца ў шырыні паэтычнага радка, які сцвярджае прыгажосць жыцця, маладосць, любоў да Бацькаўшчыны.

Цікавы ў гэтым плане верш “Сон над Нёманам”. У сваім сне герой адпраўляецца з Хрыстафорам Калумбам на караблі “Санта Марыя” ў Індыю шукаць шчасця. Там вандроўнікі знаходзяць велізарныя каштоўнасці:

Там зліткі золата былі,
І перлы, і каралы… [2, с. 219].

Аднак гэта не прыносіць сапраўднага шчасця лірычнаму герою. Яму даражэй за ўсе скарбы сасновая галінка – сімвал роднай зямлі, – занесеная сюды з далёкай Бацькаўшчыны:

Тады я вырашаў адзін
Плысці да той краіны,
Што працягнула да мяне
Праз акіян галіну.

Каб адшукаць яе ў бары
Ці на высокай кручы,
Прыпасці сэрцам да яе,
Да зелені гаючай.

Няхай прышчэпіць да ствала
Мяне з сваёй галінай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абдыме ветрам і зарой
Наднёманскай крыніцы [2, с. 219].

М.Танк сцвярджае, што чужына, якая б багатая яна ні была, не можа даць чалавеку сапраўднага пачуцця радасці і шчасця. Гэта думка працягваецца ў вершах “Крыніца”, “Рэпатрыянты”, “Два лісты”, “Граніца”. Паэт гаворыць, што чалавек толькі на Радзіме можа свабодна дыхаць паветрам роднай зямлі:

Таму я і слаўлю тройчы
Радзіму, крыніцы, дрэвы,
З якімі, як час настане,
Зліецца мой голас і цень,
Якія карэннем вып’юць
З маіх грудзей усе напевы
І шумам вяршынь абвесцяць
Другі нараджэння дзень [2, с. 217].

У гэтым вершы “Крыніца” страфа і рыфма зліваюцца ў непадзельнае гучанне, якое нагадвае верш у прозе, што надае твору своеасаблівую музыкальнасць і напеўнасць. Такая шырыня рытмічных інтанацый гаворыць аб уменні аўтара бачыць рэчаіснасць цэласна і ўсеабдымна. Свет паэта заўсёды звязаны з зямной рэальнасцю, але гэта свет мастака з рамантычнай узнёсласцю і палётам фантазіі. М.Танк умее разгледзіць вялікае ў малым. Кожнае імгненне жыцця яму хочацца адбіць у слове, занатаваць у запамінаючыхся гуках і чароўных фарбах прыроды.

Вобраз лесу з’яўляецца скразным у творчасці пісьменніка. Ён паэтызуецца ва ўсіх кнігах паэта.

Звіняць тугія сасновыя струны,
Рэха калышыцца звонка,
Слухайце ж вы, маладыя сасонкі,
Больш я не буду задумным і сумным!
Час яшчэ твару майго не зразорыў,
Плечы не гнуцца яшчэ пад гадамі,
Кожнае дрэва абвіў бы рукамі,
Ночы і дні гаварыў бы я з борам [2, с. 75].

Мастак слова надзяляе лес якасцямі чалавека, які ўмее слухаць і гаварыць, а галоўнае – зразумець душэўны настрой аўтара. Магнетызм лесу і паветра стварае асаблівую духоўную атмасферу, у якой добра думаецца, лёгка мроіцца. Любуючыся прыгожымі краявідамі, гледзячы на векавыя дрэвы, лясныя травы, прабягаючыя аблокі, М.Танк усведамляе асноватворныя глыбіні і магутныя сілы царства прыроды. Лес – аснова ландшафтнага партрэта зямлі, нацыянальны пейзаж і ў той жа час гэта аснова светабудовы беларуса-працаўніка.

Калі чытаеш вершы паэта-рамантыка, дзе паэтызуюцца славутыя нарачанскія прасторы, то згадваюцца словы вядомага пісьменніка В.Карамазава: “…Не дзесяткі гадоў, а стагоддзі, многія вякі лес працуе на нейкі адзін дзень, на адно дрэва, на адзін бор, адзін гай, і каб ведаць лес,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

трэба зразумець, здаровым зрокам і слыхам бачыць і чуць, душой адчуваць і памятаць гэты лесавы абсяг часу” [1, с. 331].

Згадваюцца вершы “Калі вецер вее”, “У лесе”, “Лясы, лясы і пералескі”, “Бор”, “Збор арэхаў”, “Ля гэтых сосен”, “Шмат хто бор лічыць толькі борам…”, “Пах баравікоў”, “У гэтым лесе з кожным годам менш…”, “Бор замёр, бліскавіцай ахоплены…” і іншыя, дзе кожная маляўнічая карціна лесу, бору непаўторная. М.Танк любуецца разгалістымі кронамі соснаў і ёлак, густымі кустамі арэшніку, на поўныя грудзі ўдыхае пах драўлянай смалы і чырвонагаловых баравікоў, па-дзіцячы здзіўляецца шумлівасці і гарэзлівасці старажытнага лесу. У лірыцы паэта вобраз сасны – векавечны сімвал роднай зямлі, які нясе ў сабе духоўна-эстэтычны змест. У сваіх творах аб прыродзе мастак стрыманы ў пачуццях, нават крыху рацыянальны, што абумоўлена філасофсскай скіраванасцю пошуку духоўных запатрабаванняў сучасніка ў яго маральна-эстэтычным і этычным жыцці. У мастацкай прасторы М.Танка вобраз лесу – утваральная дамінанта, з якой спалучана шырыня думкі, узлёт да вышыні пачуццяў, багацце матываў і сэнсаў. Паэт упэўнены, што няма ў прыродзе бязмоўных дрэў, нязвонкіх крыніц, няшумных дарог.

Вось чаму люблю я
Тут бываць і сённі,
Тут блукаць па гэтых
Нетрах баравых,
Дзе глядзяць са мною
Ў казачным тоні
Сосны векавыя,
Затаіўшы дых [2, с. 609].

Аўтар надзелены выключным дарам паэтычнага ўспрымання рэчаіснасці. На мове верлібра вядзе няспешную гаворку пра неабходнасць раўнавагі паміж прадметна-прыродным і духоўна-маральным у звычайным жыцці, разумення быцця штодзённага як грані гуманізму. М.Танк хвалюецца, каб чалавек не страціў сваёй зямной асновы, зямнога прыцягнення, бо гэта яго дом, родны кут – аснова духоўнай каштоўнасці.

Творчасць М. Танка з’яўляецца своеасаблівай гістарычнай храналогіяй развіцця Беларусі дваццатага стагоддзя, зафіксаванай у вербальна-паэтычнай форме. Гэта своеасаблівы сінтэз перажытага і асэнсаванага грамадскага і духоўнага вопыту беларускага народа ў пераходны перыяд паміж рознымі гістарычнымі фармацыямі. Апроч таго, гэта своеасаблівая аўтарская рэфлексія над лёсам Радзімы і яе народа.

Паэзія М. Танка здзіўляе сваёй разнастайнай тэматычнай класіфікацыяй, вобразнасцю, метафарычнасцю, мастацкімі формамі. Больш за ўсё прывабліваюць увагу ў яго творчасці такія тэмы як тэма Радзімы, тэма традыцыйнай народнай культуры, песні, паданні народа, праз якія перадаецца чысціня калектыўнай душы беларусаў, рэвалюцыйныя матывы, вайна, што стала страшным выпрабаваннем для лёсу беларусаў, тэма паэта і паэзіі. А ўсё гэта пастаянна суправаджаецца шчымлівым акордам любові і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кахання – любові да роднага крю (вершы “Ёсць у свеце планета Зямля”, “Наднарачанскія сосны”, “ Радзіма”…) і шчырай, вернай, адданай любові да роднай мовы ( “Родная мова”, “Я гэта люблю падарожжа”, “Лемантар”). Тэма ж кахання – яркага, кранальна-сціплага – суправаджае паэта праз усё жыццё (“Апала зорка , і на міг…”, “ Бурштын”, “Мне пару крыл дало юнацтва”).

Тым не меш, пра што б ні пісаў Максім Танк, ён ніколі не застаецца староннім назіральнікам у адносінах да апісваемых падзей ці з’яў рэчаіснасці. Наадварот, ён заўсёды падае ўсё ад сэрца і праз сэрца. А гэта надае творам паэта характар шчырай спавядальнасці. Невыпадкова чытач з першых радкоў пачынае максімальна давяраць аўтару, суперажываць прачытанаму,сачыць за ходам думкі пісьменніка. Не можа не крануць у гэтым плане адзін з апошніх вершаў паэта “Як жа сталася гэта”. Спавядальная форма дадзенага твора ў першую чаргу высвечвае чалавечнасць паэта , шкадаванне мужчыны-мужа аб тым, што жонка першай адышла ў Вечнасць, парушыўшы тым самым клятву, якую некалі яны далі адзін аднаму “…пакляліся разам // Бурны Сцікс пераходзіць” [2, c.974 ]. Такой жа інтымна-спавядальнай экспрэсіяй напоўнены і верш “ На саракавы дзень”. Ужо першы радок твора - “ разліта горкая горыч” - прымушае чытача задумацца аб уласных жыццёвых выпрабаваннях, аб уласных набытках і стратах, аб пэўнай агульначалавечай сістэме каштоўнасцяў. Міжволі пачынаеш разумець, што ёсць моманты дробязнага, нявартага нашай увагі, а ёсць нешта такое, што засланяе сабой усё астатняе, становіцца сэнсам і твайго існаавння – гэта лёс нашых родных і блізкіх. “Горкай горыччу” афарбавана і танальнасць верша “Апошняя стрэча”. Незадоўга да сваёй уласнай смерці пісьменнік праведаў у шпіталі свайго сябра – Пімена Панчанку. Напачатку твор носіць апісальна-побытавы характар: ідуць успаміны з ваеннага часу, прыгадваюцца славутыя персаналіі нашай культуры – паэт узгадвае, як яны разам з Панчанкам перакладалі верш Я. Купалы, змешчаны ў “Праўдзе”. Затым аўтар падыходзіць да асэнсавання сучасных яму праблем у грамадстве: ” У занядбанні яшчэ і навука і мова…” Адчуваецца, што дадзеная выснова пры падсумаванні жыцця непокоіць, трывожыць аўтара. Можа ўпершыню ў філасофскіх разважаннях паэта гучыць нейкая разгубленасць, шкадаванне: “Што ж рабіць? // Наступае ўжо восеньскі вечар”. Ці не таму так надзвычай шчымліва-кранальна ўспрымаюцца словы паэта: ”Так карціць на растанні // Сказаць: Да сустрэчы!” [2, c 972].

Такім чынам, позняму, ці развітальнаму перыяду творчасці М. Танка ўласцівы такія рысы творчасці як філасафічнасць і спавядальнасць.

Сталы перыяд творчасці М. Танка носіць характар глыбакадумнай, філасофскі-мысліцельнай формы. Часцей за ўсё гэта праяўляецца ў верлібры. Адчуваецца, што паэт працягвае традыцыі, закладзеныя некалі Максімам Багдановічам. Так, верш-верлібр “Калісьці” з’яўляецца своеасблівай медытацыяй аўтара над паняццем “Праўда”. Пісьменнік разважае над тым, што ўсё сваё жыццё ён пражыў у напружаных пошуках праўды, ды так яе і не адшукаў. Мусіць, у кожнага яна свая і кожны з нас укладвае свой сэнс у гэтае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паняцце. Верш “Толькі каменныя ідалы” прысвечаны філасофскаму асэнсаванню канцэпта “Будучыня”. Кароценькі верш увабраў у сябе цэлую сістэму інтэлектуальнага светабачання, згодна з якой толькі “аканямелыя сэрцам”, толькі засохлыя дрэвы, толькі астылыя зоры і толькі мёртвыя не трывожацца за будучыню. Верш “На экзамене” адлюстроўвае рэфлексію аўтара над тэмай мастака і мастацтва, паэта і паэзіі. Сюжэтны твор распавядае пра сітуацыю на экзамене, калі ў адказ на пытанне, у якой імперыі не заходзіла сонца, у адказ прагучала: “у імперыі паэзіі”.

Такім чынам, філасофская лірыка М. Танка прысвечана паэтызацыі як нацыянальных, так і агульначалавечых каштоўнасцяў. Кожны філасофскі верш паэта – гэта своеасблівая прычта з глыбокім падтэкставым, павучальным сэнсам, напоўненым асацыятыўным зместам.

Літаратура


1) Карамазаў, В. Дома: Аповесці, апавяданні / В.Карамазаў. – Мн., 1984,- 246.
2) Танк, М. Збор твораў / М.Танк. – Мінск : Мінская фабрыка каляровага друку, 2010. – 1008 с.
3) Танк, М. Збор твораў у 4-х т. / М.Танк. – Мінск : “Беларусь”, 1967. – 4т., – 700 с.


РИЙ БГПУ